# Тэма Савецка-польска-германскія адносіны ў канцы 1925 г. – вясной 1926 г.

1. Спробы заключэння польска-савецкага дагавора аб ненападзенні ў пачатку 1926 г.

2. Працяг савецка-германскіх палітычных перагавораў пасля заключэння гандлёвага дагавора.

3. Спробы польскай дыпламатыі арганізаваць міжнародны дэмарш супраць савецка-германскага дагавора аб нейтралітэце.

4. Берлінскі дагавор і яго міжнароднае значэнне.

# Літаратура

Ахтамзян, А. А. Рапалльская политика. Советско-германские отношения. 1922–1932. – М., 1974.

История дипломатии. (Под редакцией А. А. Громыко). В 5 т. – М., 1965. – Т. 3.

Мезга, Н.Н. В тисках Рапалло: германский фактор в польско-советских отношениях 1921–1926 годов. – Гомель, 2010.

Мезга, Н. Н. Советско-польские отношения 1921–1926: новый этап противостояния. – Гомель, 2019.

Турок, В. Локарна (5–16 октября 1925 г.). – М., 1949.


ЄВРОПА ПІСЛЯ ПЕРШОЇ СВІТОВОЇ ВІЙНИ:
ТЕРИТОРІАЛЬНІ ЗМІНИ І ПОЛІТИЧНИЙ РОЗВИТОК (1919 – 1923 рр.)
Кордони держав на 1914 р.
Території, втрачені Німеччиною за Версальським мирним договором 28 червня 1919 р.:
Ельзас і Лотарингія, передані Франції;
Саар, переданий під управління Ліги Націй на 15 років;
Кордон між Австрією й Угорщиною в 1914 р.
Території, втрачені Австрією за Сен-Жерменським мирним договором 10 вересня 1919 р.:
Південний Тироль, приєднаний до Італії;
Буковина, увійшла до складу Румунії;
Території, втрачені Болгарією за Нейїським мирним договором 27 листопада 1919 р.:
Західна Фракія, приєднана до Греції;
Території, втрачені Угорщиною за Тріанонським мирним договором 4 червня 1920 р.:
Трансильванія і Східний Банат, приєднані до Румунії;
Бургенланд, переданий Австрії
Місто Шопрон, повернуте Угорщині в 1922 р.
Територія Туреччини за Севрським мирним договором 10 серпня 1920 р.
Велика Вірменія за Севрським договором
Раппальський договір 12 листопада 1920 р. між Італією та Королівством Сербів, Хорватів і Словенців:
Кордони держав на 1923 р.
Початок фашистського руху
ВЕЛИКА БРИТАНІЯ
НОРВЕГІЯ
ШВЕЦІЯ
ФІНЛЯНДІЯ
ЕСТОНІЯ
ЛАТВІЯ
ЛИТВА
ДАНІЯ
НІДЕРЛАНДИ
БЕЛЬГІЯ
НІМЕЧЧИНА
ПОЛЬЩА
ФРАНЦІЯ
ШВЕЙЦАРІЯ
АВСТРІЯ
ЧЕХОСЛОВАЧЧИНА
УГОРЩИНА
РУМУНІЯ
БОЛГАРІЯ
АЛБАНІЯ
ГРЕЦІЯ
ІТАЛІЯ
ТУРЕЧЧИНА
ПЕРСІЯ
Російська СФРР
СОЮЗ РАДЯНСЬКИХ СОЦІАЛІСТИЧНИХ РЕСПУБЛІК
Українська СРР
ПІВНІЧНЕ МОРЕ
БАЛТІЙСЬКЕ МОРЕ
ЧОРНЕ МОРЕ
АДРІАТИЧНЕ МОРЕ
ТІРРЕНСЬКЕ МОРЕ
ІОНІЧНЕ МОРЕ
СЕРЕДЗЕМНЕ МОРЕ
АЗОВСЬКЕ МОРЕ
Алжир (Фр.)
Туніс (Фр. прот.)

# Спробы заключэння польска-савецкага дагавора аб ненападзенні ў пачатку 1926 г.

**Уплыў Лакарнскіх пагадненняў на міжнародную сітуацыю**

- Значна зменшыўся ўплыў Францыі на малыя дзяржавы Еўропы
- Зменшылася эфектыўнасць франка-польскага саюза
- Дамінуючай дзяржавай у Еўропе стала Англія
- Пагроза для Рапала
- Нармалізацыя адносін Германіі з яе праціўнікамі па Першай сусветнай вайне
- У Заходняй Еўропе створана сістэма калектыўнай бяспекі
- Аб'ектыўныя перадумовы для польска-савецкага збліжэння

# Пазіцыі СССР і Польшчы перад аднаўленнем перагавораў

**СССР**

Урэгуляванне адносін з Польшчай, але на савецкіх умовах.

Заключэнне гандлёвага дагавора звязвалася з ліквідацыяй абавязацельстваў па Рыжскаму дагавору.

Абмеркаванне ў першую чаргу палітычных пытанняў.

Асобны дагавор з кожным заходнім суседам.

**Польшча**

У першую чаргу імкненне падпісаць гандлёвы дагавор.

Абавязковае выкананне Рыжскага дагавора.

Агульны дагавор СССР з Польшчай і прыбалтыйскімі краінамі.

# З тэлеграмы паўпрада ў Варшаве П. Войкава ў НКЗС з прапановамі да вядзення перагавораў з Польшчай. 18.12.1925.

«Я прапаную надыходзячыя перагаворы па гандлёвым дагаворы ператварыць у агульныя перагаворы вялікага палітычнага значэння з Польшчай. Я лічыў бы, што гандлёвы дагавор трэба было б паставіць у сувязь не толькі з ліквідацыяй некаторых артыкулаў Рыжскага дагавора, але таксама і пытання адносна ваеннай канвенцыі Польшчы з Румыніяй.

Менавіта зараз польскі ўрад павінен быў бы пайсці на максімальныя саступкі ў пытанні магчыма нават і ваеннай канвенцыі з Румыніяй.

Можна было б узбудзіць пытанне аб якой-небудзь заяве Польшчы ў сэнсе пацвярджэння сваіх абавязацельстваў па 7 артыкуле Рыжскага дагавора аб правах нацыянальных меншасцей. Зрабіць гэта можна было б толькі дзеля торгу, бо на гэта Польшча наўрад ці пайшла б».

АЗПРФ. Ф. 04. Воп. 32. Спр. 52668. П. 217. Арк. 118.

# Пачатак польска-савецкіх перагавораў

22 і 28 студзеня 1926 г. – у гутарках з Чычэрыным Кентжыньскі выказаўся за пачатак гандлёвых перагавораў.

30 студзеня – тэлеграма Г. Чычэрына П. Войкаву.

18 лютага – С. Кентжыньскі падчас гутаркі з Г. Чычэрыным адзначыў непрымальнасць для Польшчы двухбаковай савецка-польскай дамовы аб ненападзенні, бо яна пазбаўляе Польшчу магчымасці ў выпадку неабходнасці аказаць дапамогу прыбалтыйскім дзяржавам.

26 лютага – у час сустрэчы з Чычэрыным Кентжыньскі выказаўся за заключэнне калектыўнага пакта аб ненападзенні паміж СССР, Польшчай і прыбалтыйскімі дзяржавамі (адмова з савецкага боку, бо гэта ўзмацняе польскі ўплыў у Прыбалтыцы). Польскі бок настойваў, каб СССР узяў на сябе абавязацельства не нападаць на Румынію на працягу дзеяння савецка-польскага дагавора (адмова з савецкага боку з-за Бесарабіі).

## З інструкцыі НКЗС паўпраду ў Варшаве П.Войкаву да перагавораў з Польшчай. 09.03.1926.

«Калегія на ўчарашнім сваім пасяджэнні пастанавіла: а) … катэгарычна заявіць палякам, што якое б то ні было фіксаванне зацікаўленасці Польшчы ў Прыбалтыцы не можа быць базай для перагавораў б) неабходна зараз жа заявіць палякам, што да выпрацоўкі той ці іншай базы палітычнага пагаднення, перагаворы аб гандлёвым дагаворы з'яўляюцца заўчаснымі»

АЗПРФ. Ф. 04. Воп.32. Спр. 52672. Арк. 24

**Няўдача Польшчы на сесіі Лігі Нацый у Жэневе**

**Гатоўнасць пайсці ў канцы сакавіка на саступкі на перагаворах з СССР: адмова ад патрабавання непасрэднага ўдзелу краін Прыбалтыкі ў перагаворах, але гарантыя іх граніц у дагаворы.**

# Асноўныя ўдзельнікі савецка-польскіх перагавораў



Г. Чычэрын



П. Войкаў



А. Скшыньскі



Ст. Кентжыньскі

# Працяг савецка-германскіх палітычных перагавораў

Адпраўны пункт савецкай палітыкі ў дачыненні да Германіі ў канцы 1925 г. – у выніку Лакарна Германія можа быць уцягнутай у адзіны антысавецкі фронт, які стварае Вялікабрытанія. Такі ход падзей трэба прадухіліць праз заключэнне новага палітычнага дагавора з Германіяй.

У аснове палітыкі Германіі ў адносінах да СССР пасля Лакарана – добрыя адносіны з СССР застаюцца важным інструментам рэвізіі Версаля і прыносяць Германіі эканамічныя выгады.

Такім чынам, мелася аб'ектыўная аснова для перагавораў аб палітычным дагаворы

21 лістапада – савецкая прапанова Германіі падпісаць палітычны дагавор.
Снежань 1925 г. – візіт Г. Чычэрына ў Берлін, аднаўленне палітычных перагавораў

# Перагаворы Г.Чычэрына ў Берліне 19 – 22 снежня 1926 г.

19 снежаня – гутарка са стац-сакратаром Шубертам. Адмоўнае стаўленне немцаў да палітычнага дагавора. Прапанова для СССР уступіць у Лігу Нацый.

21 снежня – гутарка са Штрэземанам. Германскі міністр гаварыў аб неабходнасці заха-ваць ранейшыя адносіны з СССР, але супраць падпісання дагавора аб нейтралітэце. Германія не будзе аўтаматычна далучацца да санкцый Лігі Нацый. Аформіць абмен думкамі ў пратаколе

22 снежня ў гутарцы з Лютарам Чычэрын нагадаў пра абяцанне канцлера пакінуць за Германіяй свабоду ў трактаванні арт. 16 Статута Лігі Нацый

# Пазіцыі бакоў у ходзе савецка-германскіх палітычных перагавораў

**СССР**

Падпісанне шырока-маштабнага палітыч-нага дагавора

**Германія**

Падпісанне палітыч-най заявы, затым - пратакола (30. 12.1925)

**Фактары, якія паўплывалі на змену пазіцыі Германіі ў ходзе перагавораў**

Перамовы СССР з Польшчай

Дыпламытычная няўдача Германіі пры вырашэнні пытання аб яе ўступ-ленні ў Лігу Нацый

**Прыняцце Германіяй савец-кай прапановы аб дагаворы.**
19 студзеня Штрэземан заявіў Крэсцінскаму аб гатоўнаці падпісаць дагавор аб нена-падзенні, 25 лютага немцы прадставілі яго праект. Але зацягванне перагавораў

# Уплыў польскага фактара на савецка-германскія перагаворы

4 сакавіка – гутарка Чычэрына з Брокдорф-Ранцау. Савецкі наркам заявіў, што СССР не мае намеру гарантаваць заходнія граніцы Поль-шчы, але готаў падпісаць з ёй дагавор аб ненападзенні адносна яе ўсходніх граніц.



25 сакавіка – гутарка Крэсцінскага і Штрэземана. Германскі міністр цікавіў-ся, якія перамовы СССР вядзе з Польшчай.

У.Брокдорф-Ранцау

27 сакавіка – ліст Штрэземана паслу ў Маскве. Брокдорф-Ранцау даручана заявіць Чычэрыну, што Германія не падпіша праектаваную дамову з СССР, калі ён мае намер падпісаць які-небудзь дагавор з Польшчай.

# Завяршальны этап савецка-германскіх перагавораў (пад уплывам няўдачы Германіі ў Жэневе)

**19 сакавіка** – у гутарцы з Брокдорф-Ранцау Літвінаў паставіў пытанне аб неадкладным падпісанні дагавора.

**30 сакавіка** бакі дамовіліся, што пры падпісанні дагавора адбудзецца абмен нотамі па пытанню ўступлення Германіі ў Лігу Нацый.

**19 красавіка** – сустрэча Крэсцінскага з Шубертам. Узгоднены ўсе палажэнні дагавора за выключэннем пункта аб безумоўным нейтралітэце.

**21 красавіка** – германская кампрамісная фармулёўка адносна нейтралітэта («нягледзячы на міралюбівы характар дзеянняў» замест «без правакацый з яго боку») – знята апошняе спрэчнае пытанне і адкрыты шлях да падпісання дагавора.

# Спробы польскай дыпламатыі арганізаваць міжнародны дэмарш супраць савецка-германскага дагавора аб нейтралітэце.

10 красавіка 1926 г. – тэлеграма А. Скшыньскага паслам у Лондане і Парыжы – давесці да французскага і англійскага ўрадаў, што савецка-германскі дагавор пярэчыць Лакарнскім пагадненням.

12 красавіка – новая тэлеграма на тыя ж адрасы: задача паслоў – дабіцца згоды Вялікабрытаніі і Францыі на накіраванне Германіі ноты супраць падпісання дагавора з СССР. Планавалася прыцягнуць да ўдзелу ў дэмаршы Італію і Малую Антанту.

Правал планаў з калектыўнай нотай. Асноўная прычына – рэзка адмоўная пазіцыя Вялікабрытаніі. О.Чэмберлен: нота ўскладніла б адносіны Германіі з Захадам, якія склаліся пасля Лакарна, што выгадна СССР.

**Спробы замаскіраваць няўдачу:** Польшча не збіралася пратэставаць супраць падпісання дагавора, а толькі імкнулася пераканацца, што ён не пярэчыць Статуту Лігі Нацый і Лакарнскім пагадненням

**Матывы, якія штурхалі Польшчу да супрацьдзеяння савецка-германскаму дагавору:**

1. Паспрабаваць пагоршыць адносіны паміж Германіяй і Захадам.

2. Дагавор перакрэсліваў спадзяванні Польшчы, што Германія не зможа сумяшчаць Лакарнскія пагадненні з Рапала.

3. Імкненне ўзняць значымасць Польшчы ў міжнародных справах.

# Берлінскі дагавор і яго міжнароднае значэнне





24 красавіка 1926 г. папісаны дагавор аб нейтралітэце і адбыўся абмен нотамі паміж савецкім і германскім урадамі. Ад імя СССР дагавор падпісаў М.Крэсцінскі, ад імя Германіі – Г.Штрэземан.

«Германія ніколі не збіралася прымыкаць да заходняй баявой супольнасці, накіраванай супраць Усходу. У сілу свайго геаграфічнага становішча Германія з'яўляецца натуральным сур'ёзным пасрэднікам і мостам паміж Усходам і Захадам» Г.Штрэземан

# Значэнне Берлінскага дагавора

1. Для Германіі даў магчымасць праводзіць паліты-ку раўнавагі з мэтай рэвізіі Версальскай сістэмы.

2. Даў магчымасць захаваць рапальскую сістэму ў адносінах паміж СССР і Германіяй пасля Лакарна. Стаў кульмінацыйным момантам рапальскай палітыкі.

3. Для СССР ліквідаваў пагрозу стварэння адзінага антысавецкага фронта і міжнароднай ізаляцыі.

4. Захавалася супрацоўніцтва СССР і Германіі на антыверсальскай аснове.

5. Пагоршыў міжнароднае становішча Польшчы, міжнародная ізяляцыя якой узмацнілася.

6. Фактычна перакрэсліў магчымасць савецка-польскага пагаднення ў блізкі час.